


## НЕ СУДЗІ... І НЕ СУДЗІМЫ БУДЗЕШ

Да сваіх пяцідзесяці з добрым хвастом Іван Фаміч жыў досыць удала. Пасля арміі ўладкаваўся на завод, ажаніўся з малодшай сястрой свайго былога аднакласніка. І сталі яны жыць-пажываць ды дабра нажываць: спярша — траіх дзяцей, потым прасторную кватэру ў заводскім доме, усю патрэбную мэблю...

І дачу яго жонка вельмі ж хацела, каб не карміць дзяцей магазіннай хіміяй, каб хоць на выхадныя з імі за горад уцякаць, каб свой кветнік, садок...

Воўк, як вядома, сабакі не баіцца, але звягі не любіць: давялося Фамічу запрэгчыся ў будоўлю, сваімі рукамі злажыць досыць прыгожы цагляны дамок, пасадзіць цыпліцы, пасадзіць з дзясятак пладовых дрэў.

Факт, што з часам на цвіценне кветак ды збор ураджаю да іх суседзі сталі прыходзіць, каб палюбавацца на тое, што вырасла, ды павохкаць ад зайздрасці.

...Гэта да таго, што і Фаміча, і жонку яго, і нават дзяцей і ў доме, і на лецішчы ведалі як людзей працавітых, старанных, гатовых прыйсці на дапамогу — прычым любому.

А зрэшты — не: аднаго чалавека Фаміч цярпець не мог. Гэта быў Ігарок, таленавіты слесар, які мог любую дэталь зрабіць (да матацыкла, да машыны), а ўжо нажы ў яго былі такія прыгожыя, што асобныя гаспадыні шкадавалі карыстацца, адна адной паказвалі, расказвалі, што грошай за сваю работу Ігарок не бярэ, а вось ад гарэлкі ніколі не адмаўляецца.

І таму Фаміча, які жыў за тонкай панэльнай сцяной, даўно ўжо «дасталі» і п'янкі-гулянкі, і амаль пастаянныя «заплывы ў шырыню». «Паглядзі на сябе, — казаў ён часам Ігарку. — Ты ж не чалавек амаль! Гэта ж трэба так апусціцца, прапіць і жонку, і здароўе...» — «Майстэрства засталося», — з форсам перапыняў яго сусед. — «А толку?.. Кватэра пустая, халадзільнік пусты, ні людскай адзежы ў цябе, ні абутку. Бамжы выглядаюць лепей...»

Пра гэта Фаміч нагадваў Ігарку разоў колькі на месяц. Ён ніколі не думаў, што вось гэта можа выглядаць... ён сам.

У той дзень (сям'я на дачы была) да Фаміча завітаў даўнейшы армейскі сябар з пляшкай дарагога каньяку (гаспадар сваю таксама дастаў)... Гадоў з дзесяць мужчыны не сустракаліся, не сядзелі за сталом — мелі што ўспомніць, чым падзяліцца, што абмеркаваць.

І не сказаць, каб позна сядзелі ці п'яныя былі. Фаміч — на сваіх дваіх, пры яснай памяці — праводзіў сябра на таксі, прыйшоў дамоў, лёг, але да раніцы не даспаў — душыла страшэнная смага. Паспрабаваў прагнаць яе вадой — марна: шурпаты язык абдзіраў у роце сухія шчокі.

Расолу ў хаце не было, гараж далёка, чаю зусім не хацелася. І тады ён успомніў, што яшчэ «учора», у маладосці, яму здаралася выбіваць клін клінам...

Карацей, бліжэй да васьмі з чырвоным і апухлым пасля ўчарашняга тварам, у старым трыко і хатніх тапках на босую нагу ён пашыбаваў у найбліжэйшую краму.

Самы першы купіў гарэлкі, праз пяць хвілін вярнуўся да сваіх дзвярэй — з пляшкай, але... без ключоў.

Запасныя былі ў жонкі (гэта значыць, на дачы) і тут, у горадзе, у замужняй дачкі. Ёй як быццам можна было б пазваніць — яна прывезла б...

Аднак мабільны таксама застаўся ў кватэры. Ды і на нейчыя вочы ў гэткім стане Фамічу трапляць не хацелася...

Пасля горкага роздуму пазваніў у кватэру суседа. Ігарок сустрэў яго з насцярогай, але, убачыўшы пляшку, адразу падабрэў: яны дружна ўзялі па першай, пасля чаго Фаміч ужо смела расказаў пра сваю непрыемнасць.

Сусед з ходу ўсё зразумеў: выцягнуў з шафы пакунак з процьмай нейкіх жалезак, потым хвілін з дзесяць «паваражыў» каля замкнутых дзвярэй...

Па другой яны пілі ўжо на кухні ў Фаміча, і гаспадар — шчаслівы — нават прабачэння ў Ігара прасіў за тое, што некалі бэсціў.

Бо яно ж сусед ёсць сусед. І ён — нават такі, як Ігар, — бывае болей патрэбны, чым далейшыя родзіч.

**Л. Хмыль,**
*г. Бабруйск.*

## НЕ «АДЗЕЖА» ЗДОБІЦЬ ЧАЛАВЕКА, АЛЕ...

Мода — не вам казаць — бывае не толькі на вопратку, абутак, мэблю, смартфоны, але і на... імёны. Расказвалі, адна маладзіца з дачушкай на дзіцячую пляцоўку выйшла, з іншымі матулямі разгаварылася — даведалася, што ў пясочніцы гуляюць маленькія Ізабела, Віялета, Афрадыта і Аэліта. Ёй за сваю Марусю аж няёмка стала...

Гэта — пра імёны для дзяўчынак. З хлопчыкамі, вядома ж, не прасцей. Не ведаю, якія звесткі могуць даць аддзелы загсаў, але мне здаецца, што ў апошні час ну вельмі папулярныя сталі імёны Радзівон, Яраслаў, Багдан.

З гэтай нагоды адна гісторыя.

...За час працы ў школе мне даводзілася сутыкацца з самымі рознымі імёнамі вучняў, з рознымі прозвішчамі. Некаторыя былі прыгожыя, мілагучныя, некаторыя, можа, і не вельмі. Але ж недарэмна кажуць, што не «адзежа» здобіць чалавека, а чалавек адзежу.

Дык вось. У пачатку таго навучальнага года мне зноў дастаўся пяты клас (з адзінаццатым у мае развіталіся)... Адказны момант — знаёмства з вучнямі: ад таго, якім яно будзе, у многім залежаць далейшыя адносіны...

Ведаю: дзеці не вельмі любяць, калі іх называюць па прозвішчах — лепш па імёнах, але ж запомніць усе і адразу досыць складана.

Папярэдне праглядаю спіс і вачам не веру: у маім класе з 22 вучняў... палова Уладзіславаў, чатыры Кацярыны, тры Данілы і тры Дар'і. Значыць, з запамінаннем імён ніякіх праблем?

І на прозвішчы тады звярнула ўвагу: Рыбак, Мянтус, Галавач...

Аднак гэта — палова гісторыі. Як заўсёды, дайшла чарга да дзённікаў. На дошцы пішу расклад урокаў і факультатыўных заняткаў, імёны-прозвішчы настаўнікаў: матэматыка — Бурак, англійская мова — Капуста, беларуская мова і літаратура — Салата...

Карацей — з вучняў у нас атрымаўся вадаём з рыбкамі, а з настаўнікаў цэлы агарод!

Цяжка было не рассмяяцца.

А бацькам, выбіраючы імёны для сваіх нашчадкаў, не грэх бы і задумацца, ці трэба гнацца за модай.

**І. Салата,**
*г. Гродна.*

## ПІЦЬ МОЖНА ЎСІМ... АЛЕ, ВЯДОМА Ж, НЕ ЎСЁ

...Ёсць меркаванне, што плёткі плесці ды языкамі малоць любяць жанчыны. Мужчынам, маўляў, гэта не ўласціва.

Казаць так можа хіба той, хто Гену не ведае, бо яму ў справе распаўсюджвання чутак проста роўных няма! Жанчыны-пляткаркі — нават самыя заўзятыя — з ім і побач не стаялі: яны, калі дзе што-якое, часам не чулі яшчэ, а Генік ужо ўсё ведае і ўсім расказвае з уласнай мастацкай апрацоўкай, ды яшчэ і начальству даносіць. А потым, што самае крыўднае, разам з іншымі абураецца: маўляў, хто ж гэта здаў-залажыў, якая «жанчына лёгкіх паводзін»?

Мужыкі, якія з Генам працуюць, гэтыя фокусы даўно ўжо ведаюць і ўвагі на іх амаль не звяртаюць, бо што з яго возьмеш? Хіба... грошай, бо скінуцца ды выпіць Генік, як той піянер, заўжды гатовы.

Дык вось, значыць. Неяк стрэслі яны змесціва кішэняў, купілі віна, трохі выпілі (астатняе на потым пакінулі і, вядома ж, прыхавалі: навошта, каб на вачах было?), пайшлі працаваць — усе. Але ж Генік з нейкай патрэбы праз паўгадзіны вярнуўся, у бытоўку забег. А там, на самым відавоку, бачыць, пляшка стаіць — тая самая, што купілі, з тым самым ружовым вінам. І недапітая... А наколькі — Генік падумаў — ніхто ж не заўважыць? Значыць, грэх не прылашчыцца?

Схапіў тую пляшку аберуч, спехам каўтануў і толькі потым адчуў, што ў бутэльцы зусім не віно, а разведзены... бензін (нехта, відаць, пілу запраўляў)... Генік куляй з бытоўкі, давай пляваццa ды рот паласкаць, давай пальцы на язык масціць, каб вярнуць неяк тое, што глынуў... А яно ж — аніяк, яно іншым шляхам на выхад просіцца.

Гена тады ў сарцір — і раз, і два, і тры... (Можа, такая рэакцыя на прадукт была, а можа, з перапуду?) Карацей, працаваць яму няма калі. Мужчыны пытаюцца, што зрабілася, а ён толькі рукой махне і пабег...

Дні са тры так лётаў, пакуль трохі ачухаўся. Але і пасля гэтага не курыў — баяўся, каб не бабахнула, бо ці мала што там унутры засталося? Іскра праскочыць і капцы — узарвешся, як той шахід...

Пацешылася брыгада: мужчыны сумысля пры ім курылі, нават тады, калі не хацелася, наперабой казалі: «Генік, на, пакаштуй маіх».

А Гену, беднаму, і хочацца, як той казаў, і не даскочыцца. Жонка думала, кіне курыць... Аж не: адважыўся неяк — засмаліў. Мужыкі на ўсякі выпадак расступіліся, а ўжо ж нарагаталіся... І Генік з імі. Палічыў заадно, што за тыя дні грошай сэканоміў на пяць пачкаў цыгарэт ці на пляшку віна. Давялося «праставіцца», улагодзіць брыгаду: мужчыны пасля гэтага перасталі даставаць. А Генік — хоць трохі пляткарыць... Не да гэтага неяк было.

**С. Кузняцоў,**
*Быхаўскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў



# Наўскі чацвер

## Што можна знайсці на вясковых могілках

Вы, напэўна, здзівіцеся, але я, вясковае дзіця, выхаванае ў спрадвечных традыцыях, лічы, да гадоў сямнаццаці не ведала, што такое Радаўніца. Канешне, дзесьці штосьці чула і чытала, але тады гэты дзень не быў выхадным і ў нашай мясцовасці ніяк не адзначаўся. Каталікі згадвалі сваіх памерлых увосень, на Усе Святыя. 1 лістапада на могілках, якія ў нас зусім блізка ад былой мяжы, з «польскага» боку, збіралася процьма людзей, ехалі адусюль, не зважаючы на працоўны дзень. А пасля ў ранняй восеньскай цемры, калі надвор'е было зацішнае, на магілах, дагараючы, трымцелі яркімі агеньчыкамі свечкі. Вясной жа ішлі да спачылых з раніцы непасрэдна на Вялікдзень, пакідалі ім чырвоныя яйкі і ішлі адзначаць вялікае свята па дамах.

Гэта там, дзе я вырасла. А вось на радзіме маёй мамы, зусім недалёка, у тым жа раёне, толькі бліжэй да Мінска, адзначалі «мёртвы Вялікдзень», ці Наўскі чацвер. Мы кожны год у першы чацвер пасля праваслаўнага Вялікадня ездзілі на могілкі да бабулі, бо яна калісьці маме, сваёй дачцэ, наказала: часта прыходзіць на магілу не трэба, але ў Наўскі чацвер — абавязкова. І мама запавет выконвала: штогод адпрошвалася з працы, кідала і ўрокі, і справы завуча — і мчала ў свае Кукшавічы. Аб тым, каб яе не адпусціць, у дырэктара нават думкі не было — ведаў: усё роўна паедзе. Мяне матуля брала з сабой усяго некалькі разоў, але менавіта гэтыя паездкі да родных на Наўскі чацвер і сёння асацыююцца ў мяне з памяццю продкаў і з повяззю Роду.

Ехаць трэба было на першым аўтобусе да Дзяржынска, таму прачыналіся рана, гадзін у пяць. Мама бегла да цёткі Юзэфы — у яе пад хатай на сонечным баку раней чым ва ўсіх расцвіталі ярка-жоўтыя нарцысы і пунсовыя з жоўта-чорнымі асяродкамі цюльпаны, і гаспадыня заўсёды дазваляла Васілеўне нарэзаць з іх букет. Так і ішлі мы на аўтобус у суседнюю вёску — у настылай нясмелай вясновай раніцы, амаль не размаўляючы, а ў руках пагойдваліся крохкія ад красавіцкай прахалоды кветкі. Прыязджалі ў Дзяржынск, хуценька пераскоквалі ў аўтобус на Станькава. Ехалі зусім нядоўга. За чыгуначным пераездам, праехаўшы наскрозь Малінаўку, прасілі кіроўцу спыніцца і, збочыўшы на шэрую, мяккую пад падэшвамі дарогу, кіравалі не да вёскі, што свяцілася прыветлівымі хатамі на даляглядзе, а на яе ўскраіну, да купкі бялюткіх бяроз, на якіх дзе-нідзе чарнелі вялізныя шматгадовыя буслянкі.

Менавіта на гэтых светлых кукшавіцкіх могілках раз на год, у Наўскі чацвер, збіралася ўся наша далёкая і блізкая радня з мамінага боку. Цэлы «квартал» на тых кладах быў наш. Прадзед Кірыл і прабабка Серафіма, яе маці Алеся, мамін дзядзька Валодзя, які пасля службы на Тоцкім палігоне памёр у дваццаць дзевяць гадоў, дзед, бабуля, маміны цётка Марыя, дзядзька Коля, іншыя далейшыя сваякі... Многія з іх памерлі задоўга да майго нараджэння, але мама расказвала пра іх як пра жывых, і таму яны ў свядомасці заўсёды былі неад'емнай часткай сям'і.

Пакуль мы парадкаваліся на магілах, збіраліся іншыя сваякі і зблізку, і здалёк. Адпрошваліся з работы, бралі за свой кошт — але на могілках былі ўсе. Пасля прывітанняў-пацалункаў ішлі хрыстосавацца з памерлымі. Кожны прывозіў з сабой пачастункі для іх — яйкі, цукеркі. Мы з мамай ішлі разам з усімі з мяшэчкам, даставалі свае гасцінцы: прадзеду і прабабцы, яе маці Алесі, дзядзьку Валодзю, дзеду, бабулі, цётцы Марыі, дзядзьку Колю... На кожнай магілцы пасля такога агульнага абходу заставалася ляжаць з паўтузіна яек і жмені цукерак... Гэткае матэрыяльнае сведчанне таго, што іх, памерлых даўно і нядаўна, памятаюць, любяць, расказваюць пра іх сваім дзецям.

Пасля на прагаліне паміж агароджамі проста на траве засцілалі абрус, ставілі прывезеныя стравы, даставалі бутэльку (шмат не пілі ніколі, але прыгубіць у гэты дзень павінен быў кожны дарослы). Сядзелі дружнай сям'ёй, расказвалі адно аднаму навіны, а мы, іхнія дзеці, паміж сабой ужо траюрадныя, а то і чацвераюрадныя, насцярожана пазіралі адно на аднаго, але вельмі хутка смялелі, знаходзілі агульныя інтарэсы. Я і сёння думаю: што гэта — покліч крыві? Бо мы ж былі амаль незнаёмыя паміж сабой, бачыліся толькі зрэдку, і адкуль тады нешта няўлоўна-агульнае, і гэта разуменне з паўслова, і нешта роднае ў рысах і руках?.. А можа, гэту еднасць давала веданне таго, што Алеся, якая ляжыць на кладах ужо больш за паўвека пад чорным металічным крыжам, — агульная для нас усіх прапрабабуля, а значыць, і мы — родныя людзі?

З гэтых чацвярговых паездак на могілкі я шмат даведалася пра маміну радзіму. Пасля могілак нас абавязкова клікала да сябе ў госці цётка Вера з суседняга пасёлка і, знайшоўшы ўдзячных слухачоў, гаварыла, гаварыла. Пра тое, як было раней, як хадзіла замуж за татарына, як яе пасля з таго замужжа бацька з братамі ездзілі пад Казань вызваляць. Пра Кукшавічы, вялікую вёску, якую ў 30-я спаліла адна раўнівая кабета — падпаліла хату саперніцы, а ў выніку пыхнула ўся вуліца. Пра дзіўныя назвы навакольных пасёлкаў: Малінаўка, Рабінаўка, Вінаградаўка, Марс, Юпіцер. Пра тое, як з'явіліся гэтыя паселішчы сярод чыстага поля — у іх прымусова рассялілі пагарэльцаў з Кукшавіч, каб не будавалі хаты страха да страхі на ранейшым месцы... Мы слухалі ўважліва, пілі кіславаты бярозавік, які цётка даставала са склепа, а твары дарослых, якія нарадзіліся і выраслі тут, а пасля раз'ехаліся па ўсёй краіне і толькі ў Наўскі чацвер збіраліся разам у родных мясцінах, станавіліся такімі сумнымі і кранальна-пяшчотнымі...

Пасля Радаўніцу зрабілі выхадным і на Наўскі чацвер збірацца ў Кукшавічах пакрысе перасталі. Агульная традыцыя выцесніла мясцовую, так таксама бывае. Пакрысе тыя дарослыя, якія гэтую мясцовую традыцыю падтрымлівалі, якія давалі сваім бацькам абяцанне бываць у іх на магілах у гэты дзень, самі перасяліліся на клады ў розных месцах, нас, колішніх дзяцей, падобным абяцаннем ужо не звязваючы. Мы — траюрадныя, чацвераюрадныя, цяпер рэдка бачымся, хіба што на Радаўніцу. Атрымліваецца сустрэцца не кожны год, сёлета дык дакладна не паедзем. Але, калі выпадзе добры час, абавязкова зноў збярэмся пад светлымі бярозамі, на якіх чарнеюць цяжкія шапкі старых буслянак. Мы ўжо не такія, як нашы бацькі. Мы сустракаемся без застолля, без цёплых абдымкаў. Але вітаемся, размаўляем, натоўпам ходзім з мяшэчкамі гасцінцаў ад адной магілкі да другой. Знаёмім адно з адным сваіх дзяцей, якія спачатку насцярожваюцца, а потым, глядзіш, ужо і гуляюць дружна. А наша агульная пра-пра-пра.. бабуля Алеся, што ляжыць пад чорным металічным крыжам, напэўна, светла ўсміхаецца ў гэты час праз ледзь прыкметны зялёны флёр на тонкіх бярозавых галінках.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**